ПРАЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# Беларускі УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

№ 10 (1046) ● Чацвер, 21 сакавіка 1974 г. ● Цана 2 кап. ● Газета выдаецца з 1935 г.

## ПРАЗ СЭРЦА КОЖНАГА

Стан абаронна-масавай работы, перспектывы яе развіцця, шляхі паляпшэння —гэтыя пытанні абмеркаваны на сходзе актыву універсітэта.

Начальнік ваеннай кафедры палкоўнік У. В. Лютаў у сваім дакладзе адзначыў, што абаронна-масавая работа вядзецца нядрэнна: універсітэт займае вядучае месца сярод вну рэспублікі. Аднак ёсць яшчэ і фармалізм у рабоце, і недастатковая эфектыўнасць праводзімых мерапрыемстваў.

У 1973 годзе было праведзена 54 спаборніцтвы па ваенна-прыкладных відах спорту, у якіх удзельнічалі 3469 чалавек. Лічба здаецца унушальнай. Але сталі разраднікамі ўсяго толькі 309.

Дакладчык выдзеліў два моманты: партыйным, камсамольскім, грамадскім арганізацыям неабходна ўдзяліць сур'ёзную увагу ваенна-патрыятычнаму выхаванню. Пытанні абаронна-масавай работы не заўсёды ў сферы іх увагі, часам няма каардынацыі паміж агульнауніверсітэцкім планам і факультэцкімі. У баку ад гэтай работы стаяць студэнцкія прафсаюзныя арганізацыі, якія з гатоўнасцю перадаручаюць свае абавязкі камітэтам ДТСААФ.

Старшыня савета ДТСААФ універсітэта М. В. Гарлатаў падрабязна гаварыў пра вынікі месячніка абаронна -масавай работы. У ходзе месячніка праведзена 26 тэматычных вечароў, 152 сустрэчы з Героямі Савецкага Саюза і ветэранамі вайн, канферэнцыі чытачоў, паходы па месцах баявой славы, масавыя спаборніцтвы па стральбе, радыёспорту; прачытана 342 лекцыі. Лепшымі факультэтамі зарэкамендавалі сябе хімічны (старшыня камітэта ДТСААФ А. С. Ляшэвіч), біялагічны (М. С. Марозік), фізічны (М. А. Батурыцкі). Адстаюць факультэты прыкладной матэматыкі (У. П. Нягода) і юрыдычны (А. У. Баркоў). Прычым камітэт ДТСААФ факультэта прыкладной матэматыкі з году ў год дрэнна працуе.

Старшыня камітэта ДТСААФ юрфака А. У. Баркоў у сваім выступленні прызнаў, што вынікі месячніка несуцяшальныя: грошы ад рэалізацыі білетаў латарэі ДТСААФ былі сабраны з вялікім спазненнем. Стралковы спорт па факультэце трымаецца на плячах энтузіястаў. Асноўная бяда ў тым, што няма дакладнай каардынацыі ў рабоце грамадскіх арганізацый і прафсаюзнай арганізацыі супрацоўнікаў у тым ліку.

Каманда універсітэта па стралковаму спорту ў сістэме «Буравесніка» ў апошнія гады пастаянна займае 5--6 месцы. Мала рыхтуецца разраднікаў па тэхнічных відах спорту.

— Спартыўная кафедра бяздзейнічае ў гэтым пытанні,—гаворыць М. В. Гарлатаў.—Я не раз гутарыў з супрацоўнікамі кафедры, але воз і цяпер на адным месцы. Я ўжо не гавару аб водна-маторным і ваенна-марскім відах спорту... Спорткафедра чамусьці не зацікаўлена ў іх развіцці...

М. І. Аносаў, адказны сакратар савета ветэранаў вайны, гаварыў аб тым, што мала яшчэ абмяркоўваецца кніг з серыі мемуараў ваенных год. Гэта ж важны рэзерв выхавання студэнтаў на баявых традыцыях старэйшага пакалення.

Бясспрэчна тое, што студэнтам блізкая, у іх жыве сувязь з гераічным мінулым. Аб гэтым сведчаць шматлікія сустрэчы з ветэранамі, сувязі з падшэфнымі воінскімі часцямі, зорныя турысцкія паходы. Толькі гэтай зімой 119 чалавек крочылі па Беларусі, Ленінградскай вобласці, пабывалі ў Карпатах, Карэліі. І ўсё ж...

— Мы часта адстаем ад патрабаванняў сённяшняга дня, недаацэньваем значэнне абаронна-масавай работы, не каардынуем яе... — сказала ў заключэнне сакратар парткома Т. Я. Дударава.

Работа гэта таму і называецца масавай, што ў ёй павінны прымаць удзел усе. Выкарыстоўваючы традыцыйныя, трэба шукаць і новыя формы работы. Чаму б не сабрацца ветэранам вайны ў студэнцкай аўдыторыі і не пагаварыць аб тым, як яны разумеюць подзвіг, як фарміравала іх характар суровая школа вайны?.. Шукаць трэба. Проста неабходна.

Л. ЛЕВІТ.

ІДЗЕ АЛІМПІЯДА «СТУДЭНТ І НАВУКОВА-ТЭХНІЧНЫ ПРАГРЭС»

## ДАБІЛІСЯ ПОСПЕХУ

На фізічным факультэце падведзены вынікі першага тура алімпіяды «Студэнт і навукова-тэхнічны прагрэс». На разгляд арганізацыйнага камітэта па спецыяльнасці «радыёфізіка» кафедра радыёфізікі і электронікі ЗВЧ прадставіла чатыры работы, кафедра электрафізікі — дзве. З іх рэкамендаваны на універсітэцкі агляд-конкурс работы студэнтаў П. Фомчанкі, М. Калівы, С. Гілеўскага. Дыпломы I, II і III ступені на факультэце прысуджаны адпаведна Я. Карыху (V курс), Л. Грамыку (III курс), М. Скрыгану (III курс).

На агляд-конкурс па спецыяльнасці «фізіка» кафедра фізікі паўправаднікоў прадставіла 8 работ, кафедра ядзернай фізікі — 2, кафедра тэарэтычнай фізікі — 4.

Да ўдзелу ва універсітэцкім аглядзе вылучаны работы М. Мінаева, Фан Тхань Дау, М. Русаковіча.

На факультэце дыпломамі I, II і III ступені узнагароджаны адпаведна Чан Хонг Ньюнг (V курс), Ю. Шэлег (V курс), В. Масолаў (IV курс).

У аглядзе-конкурсе дыпломных і курсавых работ на аддзяленні радыёфізікі ўдзельнічалі работы, прадстаўленыя кафедрамі радыёфізікі і электронікі ЗВЧ, электрафізікі, ЭММ. Ва універсітэцкім туры прымуць удзел В. Новікаў, У. Апанасовіч, А. Белы.

У факультэцкім туры заваявалі дыпломы I, II і III ступені Тхай Ле Тханг (IV курс), В. Зяленка (V курс), Нгуен Тхі Суан.

На аддзяленні фізікі ў аглядзе-конкурсе курсавых і дыпломных работ удзельнічалі кафедры фізікі цвёрдага цела, ядзернай фізікі, фізікі паўправаднікоў, фізічнай оптыкі, тэарэтычнай фізікі. На універсітэцкі тур рэкамендаваны дыпломныя работы У. Вінакурава, А. Фёдаравых, М. Драздова. Факультэцкіх узнагарод—дыпломаў I ступені—удастоены Н. Міцькіна і Ю. Парадзінскі; дыпломаў II ступені — Г. Жураўскі і В. Анціміраў; дыпломаў III ступені — Г. Яскевіч, І. Дубоўская.

У аглядзе-конкурсе вынікаў вытворчай практыкі дабіліся поспеху В. Мачалаў, В. Авіжэню, Ф. Карзюк (аддзяленне радыёфізікі), І. Зуйкоў, Ю. Сакалоў, Т. Чанцова (аддзяленне фізікі). Яны прымуць удзел ва універсітэцкім туры.

Дыпломы заваявалі: I ступені — А. Кумейша, Г. Германенка, С. Кілін (V курс); II ступені — А. Баркоў, М. Паўлінаў, Т. Сцефановіч (V курс); III ступені — Т. Красоўская, Н. Касцюковіч, Н. Бернат (V курс).

Пераможцамі прадметнай алімпіяды па фізіцы сярод студэнтаў II курса сталі Л. Шатон, В. Манікала, Б. Меламед.

## З ВЯЛІКАЙ ЗАЦІКАЎЛЕНАСЦЮ

На біяфаку прайшла канферэнцыя, арганізаваная кафедрай сістэматыкі раслін, на якой абмеркаваны пытанні, што датычаць метадаў сістэматыкі жывых арганізмаў.

Адкрыў канферэнцыю прафесар Ю. К. Фамічоў. Затым слова ўзяў ганаровы госць, дырэктар інстытута эксперыментальнай батанікі АН БССР В. І. Парфёнаў. Ён падкрэсліў вялікае значэнне сістэматыкі ў пытаннях біялогіі. Прыемна было чуць і словы падзякі біяфаку за былых выпускнікоў, якія працуюць цяпер у інстытуце эксперыментальнай батанікі АН БССР. Адным з іх з'яўляецца Г. Вынаеў, выпускнік 1973 г., які быў удастоен залатога медаля ва Усесаюзным конкурсе студэнцкіх навуковых работ.

На канферэнцыі Г. Вынаеў выступіў з дакладам «Фітагеаграфічныя сувязі флоры Палесся з флорай Усходніх Карпат». Затым выступілі студэнты.

Вялікую зацікаўленасць праявілі ўдзельнікі канферэнцыі да пытанняў, якія асвятлялі О. Нясюк (кафедра дарвінізму), Д. Траццякоў (кафедра сістэматыкі раслін), Г. Дзярабіна (кафедра заалогіі пазваночных), В. Клейман (кафедра фізіялогіі раслін) і інш. Глыбокі даклад зрабіў А. Еўтушэнкаў, з цікавасцю былі выслуханы выступленні В. Дземчанкі і Л. Ляўковіч.

Старшыня аргкамітэта дацэнт А. С. Шуканаў падвёў вынікі канферэнцыі, адзначыў жывую зацікаўленасць да яе студэнтаў.

І. КАМЛАЧ,
студэнтка.





**На здымках:** на гістфаку ідзе студэнцкая навуковая канферэнцыя «XXIV з'езд КПСС і Праграма міру». З дакладам «Дружба і супрацоўніцтва СССР і Кубы — залог міру і міжнароднай бяспекі» выступае студэнтка IV курса Ірына Махнач.

Фота **Д. Чаховіча.**

## ПРЭС-ЦЭНТР КАМІТЭТА КАМСАМОЛА ПАВЕДАМЛЯЕ

ЦК ВЛКСМ і Міністэрства вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі СССР увялі значок «За выдатную вучобу». Ім узнагароджваюцца студэнты, якія не толькі добра вучацца, але і займаюцца навуковай і грамадскай работай.

По рашэнню бюро камітэта камсамола 208 студэнтаў універсітэта узнагароджаны гэтым значком, 1071 — прадстаўлены да ўзнагароды.





***

Нядаўна ва універсітэце адбылася сустрэча прадстаўнікоў камітэтаў камсамола трактарнага і гадзіннікавага заводаў, камвольнага камбіната з зямляцтвамі замежных студэнтаў, якія навучаюцца ў БДУ. Пасля сур'ёзнай гутаркі аб напрамках работы з моладдзю былі падпісаны трохбаковыя дагаворы аб дружбе і супрацоўніцтве: паміж камітэтам камсамола універсітэта, гадзіннікавым заводам і КССНМ; камітэтам камсамола універсітэта, трактарным заводам і Саюзам маладых камуністаў Кубы.

21 сакавіка адбудзецца сумесны вечар, прысвечаны 43-й гадавіне Саюза Працоўнай Моладзі Хо-Шы-Міна.

***

20-годдзе асваення цаліны адзначылі ва універсітэце стварэннем 9 будаўнічых атрадаў, якія ў час летняга семестра-74 будуць працаваць у Чапаеўскім раёне Уральскай вобласці. А ў г. Чапаева паедзе не зусім звычайны атрад. Яго асноўны састаў — члены агітбрыгады факультэта журналістыкі. У атрада свая праграма, якая, акрамя работы на аб'ектах, прадугледжвае канцэрты і лекцыі для іншых СБА і мясцовага насельніцтва.

Георгій Якаўлевіч Рылюк—выхаванец нашага універсітэта. У 1963 годзе закончыў геаграфічны факультэт. На працягу раду гадоў быў сакратаром камітэта камсамола універсітэта. Потым выкладчыцкая работа, актыўная грамадская дзейнасць.



**На здымку:** Георгій Якаўлевіч прымае шчырыя віншаванні. Толькі што ён абараніў дысертацыю на атрыманне вучонай ступені кандыдата геаграфічных навук. Тэма яго дысертацыі: «Змяненне прыродных умоў заходняй часткі беларускага Палесся пад уплывам антрапагеннага фактара». Спецыялісты лічаць, што работа адпавядае патрабаванням сучаснасці, мае вялікую практычную каштоўнасць.

Фота **М. Нечыпарэнкі.**

# СТУДЭНЦКІ ДЭКАН

Дэмакрыт, старажытны філосаф, гаварыў: «Па самой прыродзе кіраваць уласціва лепшаму». Лепшаму? А калі іх, лепшых, больш сотні пераступіла парог факультэта? Кожны быў першым у школе. Адзін — нязменны старшыня савета дружыны, другі —сакратар камітэта камсамола... Зараз новая ступень—універсітэт. Вось тут у некаторых актыўнасць складвае крылы, уступаючы месца сузіральнасці, афарбаванай скептыцызмам. З Данутай Трыбухоўскай такога не здарылася. Дзяўчына ўзначальвае грамадскі дэканат на філалагічным факультэце. Арганізацыя гэта робіць яшчэ першыя крокі: вырашае самастойна пытанні наведвання лекцый, паспяховасці, размеркавання дадатковых стыпендый. Грамадскі дэканат—школа кіравання. Практыка ў ёй развівае арганізацыйныя задаткі, рыхтуе да самастойнага жыцця.

Данута — першы студэнт-дэкан. Вядома, гучыць занадта салідна. Але за гэтай унушальнасцю — грандыёзная адказнасць. Якімі зоркімі вачыма, чулым сэрцам трэба валодаць, каб зразумець кожнага, за учынкам убачыць чалавека. На чорнай дошцы — прозвішчы прагульшчыкаў. Новая «Маланка». Да Дануты падыходзіць дзяўчына. «Не пішыце пра мяне, калі ласка. Я сёння...». Што скажа дэкан? Прынцыповасць, зацікаўленасць у агульнай справе, адказнасць за іншых — тыя якасці, якія робяць грамадскую актыўнасць Дануты рысай характару. Званок. Для дэкана таксама. Яна ж студэнтка II курса рускага аддзялення.

У заліковай кніжцы студэнткі Трыбухоўскай толькі выдатныя адзнакі.

Вечар. Вуліца патанае ў святле лямп-адуванчыкаў. Данута любіць вячэрні Мінск... Так, у тэатры Янкі Купалы прэм'ера. Трэба неяк узяць білет... Інтэрнат. Заўтра практычныя заняткі па рускай мове, на дзевяностай старонцы адкрыт Бальзак... Што ж, за падручнікі.

**Г. ПАЎЛАВА.**

## Народны КАНТРОЛЬ

# СЕТКАВАЕ ПЛАНАВАННЕ ВУЧЭБНАГА ПРАЦЭСУ

Для паспяховай падрыхтоўкі высокакваліфікаваных спецыялістаў важнае значэнне мае пошук новых, больш эфектыўных метадаў навучання, якія садзейнічаюць развіццю творчай ініцыятывы і навыкаў самастойнай работы. Гэта становіцца зразумелым, калі ўлічыць той вялікі аб'ём ведаў, які неабходна атрымаць будучаму спецыялісту за час навучання, і тое, што час навучання абмежаваны, а колькасць неабходных ведаў пастаянна расце.

Далейшага павышэння эфектыўнасці вучэбнага працэсу можна дабіцца шляхам павелічэння аб'ёму самастойнай творчай работы студэнтаў па вывучэнню тэарэтычных дысцыплін, правядзенню навуковых даследаванняў і іншых відах навучання пад кантролем і кіраўніцтвам выкладчыкаў і кафедр. Развіццё навыкаў самастойнай работы вельмі неабходна, таму што дазваляе прывіць студэнтам самастойнасць мыслення, крытычнае ўспрыманне вывучаемага матэрыялу і, у выніку, падрыхтаваць творчага спецыяліста. Такім чынам, узнікае неабходнасць у больш гібкім кіраванні вучэбным працэсам, які ўключае як абавязковае, так і самастойнае навучанне.

Паляпшэння якасці падрыхтоўкі спецыялістаў можна чакаць ад укаранення прагрэсіўнага метаду сеткавага планавання вучэбнага працэсу з прымяненнем ЭВМ для кіравання ходам вучэбнага працэсу. Гэты метад ужо знайшоў прымяненне ў радзе вышэйшых навучальных устаноў.

Якія перавагі метаду сеткавага планавання? Па-першае, пры гэтым метадзе ёсць магчымасць устанавіць правільныя прапорцыі паміж аб'ёмам абавязковых і самастойных заняткаў студэнтаў на працягу ўсяго перыяду навучання. У выніку студэнты загружаны больш раўнамерна, і таму адпаведна павышаецца эфектыўнасць навучання.

Па-другое, можна прымяніць ЭВМ для складання аптымальных варыянтаў раскладаў, распрацоўкі каляндарных планаў выкладчыкаў і студэнтаў, для штодзённага кантролю за ходам вучэбнага працэсу, бягучай паспяховасцю студэнтаў і апрацоўкі іншай аператыўнай інфармацыі, звязанай з вучэбным працэсам. Такім чынам, паяўляецца непасрэдная магчымасць кіраваць ходам вучэбнага працэсу, своечасова вызначаць найбольш напружаныя перыяды работы.

Некаторая работа па ўкараненню сеткавага планавання вучэбнага працэсу ўжо вядзецца на факультэтах нашага універсітэта. Так, напрыклад, складаюцца графікі, у якіх плануецца як абавязковая, так і самастойная работа студэнтаў, распрацоўваюцца метадычныя дапаможнікі для самастойнай работы студэнтаў.

Аднак у цэлым па універсітэту работа па ўкараненню сеткавага планавання з прымяненнем ЭВМ, г. зн з поўным выкарыстаннем магчымасцей гэтага метаду, вядзецца яшчэ недастаткова інтэнсіўна. Гэта растлумачваецца адсутнасцю асабістага вопыту на факультэтах і недастатковай інфармацыяй аб вопыце прымянення метаду ў іншых навучальных установах. Таму, каб сеткавае планаванне дало чакаемы вынік, неабходна разам з прадаўжэннем работы, якая ўжо вядзецца на факультэтах. укараніць яго спачатку поўнасцю на адным з факультэтаў з прыцягненнем да гэтай работы вылічальнага цэнтра БДУ. Атрыманы пры гэтым вопыт можна было б затым распаўсюдзіць на іншых факультэтах і ў канчатковым выніку стварыць адзіную сістэму кіравання вучэбным працэсам.

Бясспрэчна, што пры шырокім выкарыстанні метаду сеткавага планавання для аператыўнага кіравання вучэбным працэсам можна будзе дабіцца і больш высокай якасці падрыхтоўкі спецыялістаў.

**Л. КІРЫЛА,**
**кіраўнік сектара вучэбнай работы групы народнага кантролю універсітэта.**





Тэма сённяшніх заняткаў у трэцякурснікаў ФПМ—«Метады аптымізацыі». Лекцыю чытае в. а. дацэнта В. В. КРАХОТКА.

Фота П. Грабенчука.

## САСТАЎ ШТАБА ПРАЦОЎНЫХ СПРАЎ

**Г. М. Блінкоў,** начальнік штаба, кафедра агульнай фізікі;

**С. Д. Куніцкі,** камісар, гістфак, IV курс;

**В. А. Жданок,** памочнік начальніка штаба, фізфак, III курс;

**М. М. Дуброўскі,** томскія СБА, матфак, III курс;

**А. С. Сафонаў,** памочнік камісара, фізфак, II курс;

**Л. І. Ермаковіч,** цалінныя СБА, гістфак, IV курс;

**А. І. Каваленка,** беларускія СБА, хімфак, II курс;

**І. М. Шарый,** інтэратрады, фізфак, II курс;

**В. А. Івашкевіч,** беларускія СБА, ФПМ, III курс;

**І. В. Міляшкевіч,** гарадскі СБА, фізфак, II курс;

**В. Д. Старычонак,** малдаўскі СБА, філфак, III курс;

**М. А. Зубеня,** адказны за правядзенне заняткаў па тэхніцы бяспекі, юрфак, III курс;

**Е. Ф. Філонава,** медпадрыхтоўка, ФПМ, III курс;

**Л. Т. Агароднік,** член камітэта камсамола, філфак, III курс;

**Г. В. Макарава,** адказная за падрыхтоўку атрада праваднікоў, матфак, III курс;

**В. І. Пракошын,** намеснік сакратара парткома;

**У. Р. Івашын,** прарэктар па вучэбнай рабоце;

**М. І. Цырульнікава,** загадчыца паліклінікі.



**НА ЗДЫМКУ:** у праблемнай лабараторыі меліярацыі ландшафтаў геаграфічнага факультэта. За якасным вызначэннем раслінных узораў аспірантка Лідзія Мікалаеўна КУНЕВІЧ і старшы лабарант Надзежда Мікалаеўна ВАХНЕНКА.

АГЛЯД ДРУКУ

# УМЕЦЬ І НЕ ЎМЕЦЬ

Нават смешна задаваць каму-небудзь пытанне, навошта існуюць факультэцкія насценныя газеты. Па-першае, яны, вядома, знаёмяць з жыццём факультэта. Але ці задумваліся вы калі-небудзь над тым, што ваша газета — гэта магчымасць самавыражэння і самасцвярджэння студэнта як асобы. Дзе, як не ў факультэцкай насценнай, можна паспрачацца аб сэнсе жыцця, пафіласофстваваць, памарыць, нарэшце, даць волю свайму гумарыстычнаму настрою.

Кожны новы нумар «Алгарытма» (ФПМ) збірае шмат чытачоў. Не скажу, што газету чытаюць «ад коркі да коркі», але ў ёй заўсёды ёсць нейкі матэрыял з катэгорыі «самых-самых». Ці то інтэрв'ю з былымі воінамі, ці зусім сур'ёзны артыкул па выніках сесіі. У папярэднім нумары такой разынaчкай з'явіўся рэдакцыйны артыкул пад назвай «Постскрыптум». Гэта зварот да першакурснікаў, якія ўзялі свой першы жыццёвы бар'ер, здалі першую сесію. І сур'ёзны, і з гумарам «PS» з'яўляецца сапраўды добрым дадаткам да артыкула-роздуму «Дарэчы аб сесіі».

У гэтым месцы так і просіцца на паперу невялікае параўнанне. Матэматыкі (газета «Рошым любую задачу») таксама пішуць аб мінулай сесіі. Артыкул называецца «Вынікі сесіі». Нават беглы прагляд яго дазваляе заўважыць, што артыкула — няма. І заметкі — таксама, а ёсць толькі нейкі цыркуляр. Матэрыял складаецца з 15 сказаў. У ім — ніводнай лічбы альбо прозвішча, затое восем разоў паўтараюцца словы тыпу «неабходна, павінны» і г. д. Каму карысць ад такога артыкула — сказаць цяжка. А вось шкодзіць ён, перш за ўсё, тым жа першакурснікам, якіх патрэбна зараз проста падбадзёрыць і падтрымаць.

Расул Гамзатаў пісаў: «Няма проста слова. Яно альбо праклён, альбо віншаванне, альбо прыгажосць, альбо боль, альбо бруд, альбо кветка, альбо хлусня, альбо праўда, альбо свет, альбо цемра». Слова можа дапамагчы, можа параніць, а можа проста ўпасці ў пустату. Гэта нельга забываць у першую чаргу тым, каму выпала нялёгкая справа — выпускаць факультэцкую газету. На жаль, рэдкалегія «Рошым любую задачу» не ўлічвае гэта. Амаль усе матэрыялы апошняга нумара агульнага характару, інструктыўныя. А дзе жывыя людзі, вашы таварышы, дзе, нарэшце, ваш асаблівы студэнцкі запал і выдумка!

Змест зместам, але нельга забываць і аб форме.

«Алгарытмаўцы» выбралі сабе зручную форму. Газета выпускаецца на палосах. Гэта дазваляе з выхадам кожнага наступнага нумара не здымаць поўнасцю папярэдні, а пакідаць самыя цікавыя матэрыялы яшчэ на нейкі час. І малюнкі тут неблагія, і здымкі, а вось аўтары матэрыялаў нярэдка чамусьці застаюцца невядомымі, ды і выхадных данных—парадкавага нумара, даты, складу рэдкалегіі—няма. Скажаце, дробязі. Не, проста газетная этыка патрабуе: ганьбіш альбо хваліш—май мужнасць зрабіць гэта адкрыта.

Хай не абвінавачваюць мяне ў прадузятасці, але ад знешняга акадэмізму «Рошым любую задачу» становіцца крыху не па сабе. Рамка, тоўстае шкло і раптам мудрагелістыя загалоўкі, што разлічаны, магчыма, на чалавека з вельмі багатай фантазіяй (інакш іх проста нельга прачытаць). Бледныя палосы: ні малюнкаў, ні здымкаў, ды і рубрык не відаць. Гэта якраз той выпадак, калі газета не імкнецца мець сваё аблічча, свае традыцыі. Адсюль нават сумны гумар, які цяжка параўноўваць з алгарытмаўскім гумарам Квазі, пастаяннага героя гумарыстычнага Дэльта-клуба.

**Л. ПЕРАСЫПКІНА.**

### АКАДЭМІІ НАВУК СССР 250 ГАДОЎ

# НА ГАДАВЫМ СХОДЗЕ АКАДЭМІІ НАВУК СССР

У МАСКОЎСКІМ ДОМЕ вучоных адбыўся традыцыйны гадавы сход Акадэміі навук СССР, якая ўступіла ў свой юбілейны год. Кіруючыся пастановай ЦК КПСС аб святкаванні 250-годдзя акадэміі, савецкія вучоныя адзначаюць гэту знамянальную дату як агляд дасягненняў айчыннай навукі, яе ўкладу ў сацыялістычную вытворчасць, у нашу шматнацыянальную культуру, у барацьбу за мір і дружбу паміж народамі.

Другім ордэнам Леніна ўдастоена акадэмія ў сувязі з яе 250-годдзем. Гэта высокая ўзнагарода натхняе вучоных на новыя дасягненні на карысць Радзімы. Словамі глыбокай удзячнасці Камуністычнай партыі і Савецкаму ураду за высокую ацэнку дзейнасці акадэміі пачаў выступленне на сходзе прэзідэнт Акадэміі навук СССР акадэмік М. У. Келдыш.

— Мы прыкладзём, — запэўніў ён, — усе свае веды, сілы і здольнасці для выканання адказных задач, якія стаяць перад савецкай навукай.

Прэзідэнт выказаў таксама ўдзячнасць Дзяржаўнаму савету Народнай Рэспублікі Балгарыі за ўзнагароджанне Акадэміі навук СССР ордэнам Георгія Дзімітрова.

Трэці год пяцігодкі, працягваў вучоны, прынёс значныя зрухі ў развіцці народнай гаспадаркі і выкананні пяцігадовага плана. Ён азнаменаваўся вялікімі поспехамі ў знешняй палітыцы партыі і Савецкай дзяржавы, накіраванай на змякчэнне міжнароднай абстаноўкі. Вялікі ўклад у рэалізацыю Праграмы міру, вылучанай XXIV з'ездам КПСС, унеслі візіты таварыша Л. І. Брэжнева ў ЗША, ФРГ, Францыю, Індыю, на Кубу.

Паляпшэнне абстаноўкі ў свеце, адзначыў М. У. Келдыш, адкрыла новыя магчымасці для міжнароднага супрацоўніцтва ў галіне навукі і тэхнікі, перш за ўсё для аб'яднання навуковых сіл і сродкаў пры распрацоўцы важных навуковых і тэхнічных праблем.

Працягваліся даследаванні па праграме «Інтэркосмас». Да каштоўных вынікаў прывёў аналіз даных, атрыманых са спадарожніка «Арэол», запуск якога быў ажыццёўлен у адпаведнасці з сумесным савецка-французскім праектам «Аркад».

Вучоны напомніў далей, што для працягу даследаванняў планеты Марс у ліпені-жніўні 1973 года былі запушчаны аўтаматычныя міжпланетныя станцыі «Марс». У лютым гэтага года станцыі «Марс-4» і «Марс-5» дасягнулі наваколля Марса. Станцыя «Марс-5» 12 лютага была выведзена на арбіту штучнага спадарожніка Марса і праводзіць даследаванні каляпланетнай прасторы, паверхні і атмасферы планеты.

Значныя вынікі атрыманы ў радзе раздзелаў тэарэтычнай матэматыкі і яе дадаткаў да розных галін навукі і тэхнікі. На аснове створанай тэорыі сістэм кіравання з пераменнай структурай распрацаван комплекс прыстасаванняў, які выкарыстоўваецца для кіравання прамысловымі аб'ектамі ў металургічнай, хімічнай і іншых галінах прамысловасці.

Акадэмік М. У. Келдыш падрабязна расказаў аб выдатным эксперыменце, выкананым на паскаральніку ў Серпухаве групай даследчыкаў Аб'яднанага інстытута ядзерных даследаванняў і Інстытута фізікі высокіх энергій. Імі атрыманы новы вынік у пазнанні ўласцівасцей антырэчыва: зарэгістраваны ядры антытрытыя. Аб складанасці эксперыменту, адзначыў прэзідэнт, сведчыць той факт, што чатыры ядры антытрытыя знойдзены сярод 400 мільярдаў іншых часцінак, прапушчаных цераз установку.

Упершыню у сусветнай практыцы праведзена вертыкальнае электрычнае зандзіраванне зямной кары на глыбіню 30—40 кіламетраў магутным імпульсам, які атрымліваецца з дапамогай мгд-генератара. Гэта адкрывае магчымасці даследавання саставу зямлі да грані мяжы, якая аддзяляе зямную кару ад верхняй мантыі, вывучэння механізму моцных землетрасенняў, а таксама прагнозу глыбока залягаючых цвёрдых карысных выкапняў.

У галіне грамадскіх навук закончаны шэраг даследаванняў па актуальных праблемах сучаснасці, па распрацоўцы сацыяльна-эканамічных пытанняў навукова-тэхнічнага прагрэсу, расшырэння эканамічных сувязей СССР з сацыялістычнымі краінамі.

У заключэнне прэзідэнт акадэміі сказаў:

— У Звароце Цэнтральнага Камітэта КПСС да партыі, да савецкага народа адзначаецца, што ў мінулым годзе разам з выдатнымі дасягненнямі ў развіцці народнай гаспадаркі краіны новых поспехаў дабіліся і работнікі навукі, савецкія вучоныя.

Цэнтральны Камітэт партыі выказаў упэўненасць у тым, што савецкая інтэлігенцыя будзе з яшчэ большай энергіяй, настойлівасцю развіваць навуку, тэхніку і культуру. Няма сумнення ў тым, што ў адказ на заклік нашай партыі Акадэмія навук СССР дасягне ў гэтым годзе яшчэ больш значных навуковых вынікаў, унясе сваімі даследаваннямі новы ўклад у будаўніцтва камуністычнага грамадства.

Пытанні навукова-арганізацыйнай дзейнасці прэзідыума АН СССР асвятліў у дакладзе выконваючы абавязкі галоўнага вучонага сакратара прэзідыума член-карэспандэнт АН СССР Г. К. Скрабін.

Прысутныя цёпла віталі лаўрэатаў залатых медаляў і прэмій Акадэміі навук СССР, якім былі ўручаны ўзнагароды.

(ТАСС).

# ДЗЕНЬ ПРАЦОЎНАГА СЯЛЯНСТВА



У гэтыя веснавыя дні ў далёкім Афганістане сустракаюць Новы год. Аб тым, як адзначаюць гэта свята ў дружалюбнай нам краіне, расказвае прэзідэнт зямляцтва афганскіх студэнтаў, што навучаюцца ў БДУ, Хамта Нур Махамад.

— Працоўны народ Афганістана адзначае штогод сваё нацыянальнае свята — Дзень працоўнага сялянства, або Новы год. Гэты дзень супадае з першым днём вясны, калі сяляне пачынаюць работу на палях. Гэта дні радасці, бо чалавеку ўласціва жаданне працаваць.

Першы дзень новага года супадае з 21 сакавіка.

У краіне свята праводзіцца на працягу 40 дзён. Пасля афіцыйнай цырымоніі ў правінцыях усе людзі на працягу тыдня працуюць, уключаючы нават і выхадныя дні. Яны збіраюцца разам і ў месцах адпачынку. Хоць Афганістан пакуль эканамічна слабая краіна, але яе гісторыя — гэта яркі прыклад барацьбы супраць каланіяльнага заняволення і прыгнёту.

Пад уплывам унутранай рэакцыі і пры падтрымцы знешніх імперыялістычных сіл краіна доўгія гады была пад прыгнётам манархічнага ўрада. Эканамічнае і грамадскае развіццё краіны затармазілася на вялікі перыяд гісторыі. У народа не было дэмакратычных правоў, асабліва ў жанчын.

У сувязі з карэннымі зменамі ў міжнароднай абстаноўцы, умацаваннем сацыялістычнай сістэмы і пад уплывам навукова-тэхнічнай рэвалюцыі ў нашай краіне таксама актывізавалася прагрэсіўная інтэлігенцыя. Яна ўзначаліла прагрэсіўны рух супраць эксплуатацыі і прыгнёту. У канчатковым выніку інтэлігенцыя аказала вялікі ўплыў на ўвесь ход барацьбы.

У 1962 годзе манархічныя правіцелі вымушаны былі даць народу дэмакратычныя правы. Але і парламент, і канстытуцыя былі толькі на паперы.

У апошнія гады ў краіне пачаліся бурныя дэманстрацыі, забастоўкі рабочых і студэнтаў. Гэта стварыла ўмовы для звяржэння манархіі і ўстанаўлення рэспублікі.



**● Добры настрой у афганскіх студэнтаў — 21 сакавіка іх краіна святкуе Новы год.**

Фота **М. Нечыпарэнкі.**



Юлія Пешава прыехала ў наш універсітэт пяць год назад з Сафіі. Тады ўсё было новым: і горад, і людзі, і нават клімат. Зараз у дзяўчыны многа сяброў на факультэце прыкладной матэматыкі і ў інтэрнаце № 7, дзе яна жыве.

Вось і прыйшла пятая вясна ў Беларусі. Разам з сонейкам яна прынесла новыя клопаты: хутка абарона дыпломнай работы.

Фота **Д. Чаховіча.**

**Споўнілася 26 год з дня падпісання Дагавору аб дружбе, супрацоўніцтве і ўзаемнай дапамозе паміж СССР і Народнай Рэспублікай Балгарыяй.**

# «НАШ СЯБАР—БАЛГАРЫЯ»

Штомесяц ва універсітэце на пасяджэннях кіналекторыя «Наш сябар—Балгарыя» збіраюцца выкладчыкі, студэнты, супрацоўнікі БДУ, прадстаўнікі грамадскасці сталіцы рэспублікі — члены Таварыства савецка-балгарскай дружбы. У лютым слухачы лекторыя сустрэліся з карэспандэнтам газеты «Праўда» А. І. Сімуравым, які расказаў пра сённяшні дзень Народнай Рэспублікі Балгарыі.

Сакавіцкае пасяджэнне адкрылася лекцыяй дацэнта БДУ Д. Б. Мельцара «Савецка-балгарская дружба — інтэрнацыяналізм у дзеянні».

У час наступных пасяджэнняў прафесар В. Р. Заўрыеў раскажа аб прыродзе і эканоміцы Балгарыі, доктар юрыдычных навук А. А. Галаўко — аб канстытуцыі НРБ. Паэт Н. С. Гілевіч пазнаёміць слухачоў з сучаснай балгарскай паэзіяй.

**М. МАЦЕЙКА.**



Студэнцкая дружба — залог не толькі добрага настрою, утульнасці ў пакоі, але і паспяховай вучобы, дапамогі, калі няма побач старэйшага таварыша — выкладчыка.

**НА ЗДЫМКУ:** студэнтка II курса фізфака Зоя УСАВА дапамагае разабрацца з хатнім заданнем студэнтцы з ДРВ Нгуен Тху Май.

Фота **М. Вечыпарэнкі.**

# ЦІКАВАЕ ДАСЛЕДАВАННЕ

У выдавецтве БДУ выйшла кніга «Беларусь і Балгарыя — дружба, супрацоўніцтва, братэрства». Аўтары яе Д. Б. Мельцар і П. З. Савачкін даследуюць гістарычныя традыцыі дружбы славянскіх народаў, рэвалюцыйныя і інтэрнацыянальныя сувязі, ролю Беларускай ССР у развіцці грамадска-палітычнага, эканамічнага і культурнага супрацоўніцтва паміж СССР і НРБ. Цікавы фактычны матэрыял вядзе чытача да вытокаў дружбы рускага, беларускага і балгарскага народаў, знаёміць з імёнамі беларускіх рэвалюцыянераў, якія падтрымлівалі нацыянальна-вызваленчы рух балгарскага народа супраць прыгнятальнікаў.

У кнізе паказан уплыў Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі на рэвалюцыйны рух у Балгарыі, удзел балгарскіх патрыётаў у барацьбе за ўмацаванне Савецкай улады на франтах грамадзянскай вайны супраць інтэрвентаў.

Рад старонак кнігі прысвечан сувязям выдатных дзеячоў міжнароднага і балгарскага камуністычнага руху Г. Дзімітрова і В. Каларава і працоўных Беларусі.

Ярка паказана, як мацавалася дружба нашых народаў у барацьбе супраць фашызму ў гады Вялікай Айчыннай вайны.

Шматлікія факты характарызуюць розныя формы пасляваеннага супрацоўніцтва паміж партыйнымі, дзяржаўнымі і грамадскімі арганізацыямі БССР і НРБ.

Адна з глаў кнігі расказвае аб удзеле БССР у савецка-балгарскім гандлі, эканамічным і навукова-тэхнічным супрацоўніцтве. У заключэнне аўтары гавораць аб шматбаковых сувязях у галіне навукі і народнай асветы, літаратуры і мастацтва, спорту і турызму.

Дзякуючы добраму паліграфічнаму афармленню кніга «Беларусь і Балгарыя — дружба, супрацоўніцтва, братэрства» не толькі каштоўны, але і прыемны падарунак універсітэцкіх вучоных і выдавецтва.

**В. ЛЕШЧАНКА.**

# ПАЛАЖЭННЕ

**АБ САЦЫЯЛІСТЫЧНЫМ СПАБОРНІЦТВЕ СБА БДУ ІМЯ У. І. ЛЕНІНА, ПРЫСВЕЧАНЫМ 50-ГОДДЗЮ ПРЫСВАЕННЯ КАМСАМОЛУ ІМЯ У. І. ЛЕНІНА, 30-ГОДДЗЮ ВЫЗВАЛЕННЯ БССР АД НЯМЕЦКА-ФАШЫСЦКІХ ЗАХОПНІКАЎ.**

Студэнцкія будаўнічыя атрады з'яўляюцца эфектыўнай формай палітычнага, працоўнага і маральнага выхавання студэнцкай моладзі.

Выконваючы пастанову ЦК КПСС, Савета Міністраў СССР, ВЦСПС і ЦК ВЛКСМ «Аб разгортванні сацыялістычнага спаборніцтва работнікаў прамысловасці, будаўніцтва і транспарту за датэрміновае выкананне народнагаспадарчага плана на 1974 год», студэнцкія будаўнічыя атрады універсітэта ўступаюць у сацыялістычнае спаборніцтва, прысвечанае 50-годдзю прысваення камсамолу імя У. І. Леніна і 30-годдзю вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Спаборніцтва мае на мэце павысіць якасную падрыхтоўку, арганізаванасць СБА, забяспечыць высокі ўзровень палітыка-выхаваўчай работы, эканамічную эфектыўнасць і якасць выконваемых работ.

**УМОВЫ СПАБОРНІЦТВА:**

У спаборніцтве прымаюць удзел усе лінейныя СБА БДУ імя У. І. Леніна.

Спаборніцтва падраздзяляецца на 2 этапы:

а) падрыхтоўчы — па чэрвень 1974 г.

б) рабочы — чэрвень-жнівень 1974 г.

**ПАДВЯДЗЕННЕ ВЫНІКАЎ:**

1. Вынікі сацыялістычнага спаборніцтва падводзяцца ў 2 этапы:

першы— падрыхтоўчы — да 20 чэрвеня 1974 г.;

другі — рабочы — да 15 верасня 1974 г.

2. Асноўныя крытэрыі пры падвядзенні вынікаў па першаму этапу:

а) своечасовае і якаснае ўкамплектаванне будаўнічых атрадаў;

б) правядзенне дагаворнай кампаніі з будаўнічымі арганізацыямі;

в) афармленне неабходнай дакументацыі;

г) праходжанне медагляду ва ўстаноўлены тэрмін; якаснае правядзенне заняткаў па тэхніцы бяспекі, правядзенне вучобы па спецыяльнасцях, вучобы піянерважатых, лектараў, карэспандэнтаў, выхаваўчай работы з падлеткамі;

д) наяўнасць агітбрыгады, лектарскай групы, праграм канцэртных выступленняў;

ж) паспяховае правядзенне працоўнага дэсанта—не пазней 25 красавіка. Актыўны ўдзел ва Усесаюзным суботніку 20 красавіка.

3. Асноўныя крытэрыі пры падвядзенні вынікаў па другому этапу спаборніцтва:

а) выкананне ўсіх умоў першага этапа сацыялістычнага спаборніцтва;

б) выкананне вытворчай праграмы, высокая якасць работ;

в) строгае выкананне ўсімі байцамі атрадаў устава СБА, патрабаванняў тэхнікі бяспекі, адсутнасць вытворчага і бытавога траўматызму;

г) актыўнае правядзенне шэфскай, ваенна-патрыятычнай і спартыўна-масавай работы;

д) дапамога сельскай школе;

е) якасць падрыхтоўкі і правядзення грамадска-палітычнай атэстацыі ў атрадах;

ж) арганізацыя і правядзенне нядзельнікаў пад дэвізам «Твой уклад у фонд міру»;

з) удзел у працоўным і камуністычным выхаванні падлеткаў.

4. Атрады, якія дапусцілі парушэнне ўстава СБА і тэхнікі бяспекі, адхіляюцца ад удзелу ў сацыялістычным спаборніцтве.

**УЗНАГАРОДА ПЕРАМОЖЦАЎ:**

1. Студэнцкія будаўнічыя атрады, якія занялі першае месца ў падрыхтоўчым перыядзе, узнагароджваюцца памятным вымпелам і граматамі рэктарата і камітэта камсамола БДУ.

СБА, якія занялі другое і трэцяе месцы, узнагароджваюцца граматамі камітэта камсамола.

2. Атрады, якія занялі тры першыя месцы па выніках двух этапаў, узнагароджваюцца:

— пераходным сцягам і паездкай у Брэсцкую крэпасць (1 месца);

— граматай рэктарата і грашовай прэміяй (2 месца);

— ганаровым вымпелам камітэта камсамола БДУ, граматай камітэта камсамола (3 месца).

3. Для вызначэння пераможцаў сацыялістычнага спаборніцтва створана камісія з 10 чалавек на чале з камісарам СБА БДУ С. Д. Куніцкім.

**КАМІТЭТ КАМСАМОЛА БДУ, ШТАБ ПРАЦОЎНЫХ СПРАЎ.**

# ПАДАРОЖЖА Ў ІНДЫЮ

*ПАСЛЯ ЗАНЯТКАЎ*

Калі вы, падобна Афанасію Нікіціну, жадаеце зрабіць цікавае «хаджэнне за тры моры», але не выходзячы з аўдыторыі, вам дапаможа ў гэтым Уладзімір Георгіевіч Будай, старшы выкладчык факультэта па навучанню замежных студэнтаў БДУ. Уладзімір Георгіевіч чатыры гады загадваў кафедрай рускай мовы ў Асманскім універсітэце, што ў горадзе Хайдарабадзе, і добра ведае Індыю.

У. Г. Будай прачытаў ужо больш як 60 лекцый у інстытутах, на прадпрыемствах, у студэнцкіх інтэрнатах. Выдатны апавядальнік, ён падмацоўвае свае гутаркі пра палітычнае і эканамічнае жыццё, культуру і мастацтва Індыі паказам каляровых дыяпазітываў, якіх у яго больш дзвюх тысяч.

**На здымку:** з захапленнем слухаюць студэнты II курса факультэта журналістыкі цікавы расказ.

Тэкст і фота **Г. Марозава.**





● Унізе — фотарэпрадукцыя з дыяпазітыва заклінальнік змей.



# У СЯБРОЎ

З падшэфнай Засульскай школай Стаўбцоўскага раёна ў студэнтаў гістарычнага факультэта даўнія і моцныя сувязі. Вось і на гэты раз удзельнікі агітбрыгады ў прыўзнятым настроі: едзем да сяброў! Дарэчы, дзевяць з членаў агітбрыгады — студэнты II курса аддзялення філасофіі, а шэфства над Засульскай школай — іх ударная справа. Так дружна вырашылі на камсамольскім сходзе вясной мінулага года.

Пагружана ў аўтобус апаратура, тут жа гітары і песні, верныя нашы спадарожніцы. Паўтары гадзіны язды па асфальтаванай дарозе, паўгадзіны дрыготкі па раённых дарогах — і мы ў Засуллі. Сустракаюць. Нам рады, рады і мы.

У прасторным Доме культуры хутка ўсё падрыхтавана. На сцэне масіўны стол з чырвоным абрусам, выцягнута бліжэй трыбуна. З дакладам выступае студэнтка II курса аддзялення філасофіі Валерыя Шутава. А затым — канцэрт. Захваляваліся ў зале гледачы, непаседлівыя, смешныя... Глядзяць на сцэну зачаравана і нецярпліва. Чакаюць. «Сяргей Астравы. «Маці». Чытае Васіль Жукаў»—аб' яўляе нарэшце вядучая.

І адразу адчуваецца зала. Яе мернае, глыбокае дыханне. Калі-нікалі адзін слых, калі-нікалі пчалінае гудзенне. Але калі Вася Жукаў чытаў «Пародыю на дэтэктыў», смяяліся ўсе нястрымна і весела. У момант, калі выконваў свае песні на гітары Аляксандр Вараўка, зала маўчала, напружана прыслухоўваючыся да мелодыі, нямоцнага гібкага голасу выканаўцы. Спадабаўся і рускі танец у выкананні Іры Каленікавай. Мы выходзілі на сцэну яшчэ і яшчэ раз. Спявалі з задавальненнем і весела. І апладысменты гледачоў, нашых сяброў-школьнікаў, — вышэйшая нам узнагарода.

**Н. ШАЎЧЭНКА.**

# ЦІКАВАЯ СУСТРЭЧА

Па ініцыятыве інтэрсектара камітэта камсамола ў пакоі дружбы інтэрната № 7 адбылася сустрэча замежных студэнтаў, якія навучаюцца ў БДУ, з заслужанай настаўніцай БССР Верай Мікалаеўнай Дзем'янковай. Сустрэча была прысвечана 150-годдзю з дня нараджэння К. Д. Ушынскага. Аб жыцці і дзейнасці выдатнага рускага педагога расказалі студэнткі педагагічнага інстытута імя А. М. Горкага Л. Чарнова і Л. Лазаковіч. В. М. Дзем'янкова паведаміла прысутным пра тое новае, што прыйшло ў сістэму навучання ў савецкі перыяд, адказала на шматлікія пытанні.

**Л. ШАРПАН.**

# РЭДАКЦЫІ АДКАЗВАЮЦЬ

Артыкул «Па якому праву?» («Беларускі універсітэт», № 37 за 20 снежня 1973 года), у якім ішла размова аб паводзінах студэнта У. Ягоўдзіка ў адносінах да сваёй групы, абмяркоўваўся на групавым камсамольскім сходзе. Яшчэ раней мы не адзін раз гутарылі з Ягоўдзікам, шчыра выказвалі абурэнне яго паводзінамі, стараліся пераканаць яго ў тым, што пазіцыя яго памылковая і несправядлівая. Але найбольш шчырай і падрабязнай была размова на камсамольскім сходзе. На ім выступілі А. Хатэнка, Р. Славінская, В. Сідаровіч, Л. Сільвановіч, В. Шумская, куратар групы А. А. Станюта.

Група прызнала артыкул правільным. Не мог не прызнаць гэтага і сам Ягоўдзік. Па ўсім відаць, што гутарка не прайшла бясследна для яго. Па сённяшніх паводзінах Ягоўдзіка можна меркаваць, што ён пераменіўся, пачаў больш уважліва і тактоўна адносіцца да сваіх сяброў па вучобе.

**В. ШУМСКАЯ,** староста.
**Л. СІЛЬВАНОВІЧ,** камсорг групы.
**А. СТАНЮТА,** куратар.

СПОРТ СПОРТ СПОРТ

## У БДУ — МАЦНЕЙШЫЯ

15—16 сакавіка ў спартыўнай зале БПІ праходзілі спаборніцтвы першынства Белсавета «Буравеснік» па мастацкай гімнастыцы ў праграме спартакіяды вну рэспублікі. У выніку двухдзённай барацьбы перамогу атрымала каманда нашага універсітэта. Крытэрыем пераканаўчасці перамогі служыць хоць бы той факт, што каманда універсітэта набрала столькі ачкоў, колькі ў суме набралі два другія прызёры. Тройка прызёраў у камандных спаборніцтвах размеркавалася наступным чынам:

1. БДУ — 156 ачкоў;
2. МДПІ — 93 ачкі;
3. БПІ — 63 ачкі.

У асабістым заліку І месца з выдатнай сумай балаў (45,15) заняла студэнтка БДУ, майстар спорту Люда Астапенка. Яе сяброўка па камандзе Ларыса Вараб'ёва з сумай 44,55 бала заняла ІІ месца, а Ніна Гарбунова з сумай 43,45—на трэцім месцы.

Па праграме кандыдатаў у майстры спорту ў тройку прызёраў увайшлі: Галя Майсеенка (41,3)—студэнтка Віцебскага педінстытута, Таццяна Падбярэзніна (40,65)—каманда БДУ і Наташа Зайцава (40,6) — каманда МДПІ.

Гэтыя вынікі паказваюць, што ў студэнцкай мастацкай гімнастыцы рэспублікі з'явіўся новы лідэр: каманда БДУ.

Трэба адзначыць вялікую работу трэнера пераможцаў, старшага выкладчыка кафедры фізвыхавання В. В. Сеўбы, якая шмат зрабіла для гэтай перамогі. Пасля спаборніцтваў на пытанне, чым абумоўлен поспех каманды, Валянціна Васільеўна адказала: «Мы многа і ўпарта працавалі».

***

Завяршыліся спаборніцтвы на першынство БДУ па лёгкай атлетыцы ў зімовых умовах. Упэўнена выступілі лёгкаатлеты ФПМ, гістфака і хімфака, якія і падзялілі тры першыя месцы. Асабліва трэба адзначыць пераканаўчую перамогу каманды ФПМ, у саставе якой выступалі такія вядомыя майстры, як Т. Надзеева, І. Тарасюк, І. Міскевіч, В. Жураўлёў, В. Краснапрошын, Т. Афанасьева. У спаборніцтвах прынялі ўдзел і іншыя вядомыя майстры, члены зборных каманд БДУ.

**П. ГЕРАСІМОВІЧ.**




Рэдактар **А. А. НІКОЛЕНКА.**

«Белорусский университет»—орган парткома, ректората, месткома, комитета комсомола и профкома Белорусского ордена Трудового Красного знамени государственного университета им. В. И. Ленина. На белорусском языке.

Аб'ём — 1 друк. ар. Газета выходзіць па чацвяргах. Тыраж 2000 экз.

Наш адрас: г. Мінск, Універсітэцкі гарадок, геаграфічны корпус, п. 14. Тэлефон 22-07-19.
Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КП Беларусі. АТ 07147 Зак. 376.